Настаўніца тав. Каплан прачытала „Вайну і мір" — Талстога, збор твораў Янкі Купалы і інш. Больш 15 кніг прачытала хатняя гаспадыня Готбетэр, як твор Міцкевіча „Пан Тадэуш", Ванды Васілеўскай „Полымя на балотах", Шолам Алейхема, Ожэшковай і др.

Да XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай Сацыялістычнай рэвалюцыі бібліятэка арганізуе вітрыну паказу будаўніцтва ў СССР за 23 годы совецкай улады.

У сувязі з надыходзячымі выбарамі ў мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных падабрана спецыяльная літаратура па выбарах для забеспячэння агітатараў.

Бібліятэка дабілася станоўчых вынікаў у сваёй рабоце, яна стала культурным цэнтрам, дзе насельніцтва можа знайсці для сябе добрую кнігу, прачытаць свежую газету. У далейшай сваёй рабоце мы даб'ёмся яшчэ лепшых поспехаў.

З. М. Прус,
загадчыца бібліятэкі
г. Высокае.

На тактычных заняткох Н-скай часці Зах. АВА. Намеснік камандзіра падраздзялення па палітычнай часці П. К. Абразумаў, перад наступленнем праводзіць гутарку з байцамі-актывістамі. Фотахроніка Белта.

ЗА ПРАВА НЕСЦІ СТАЛІНСКУЮ ВАХТУ

У падраздзяленнях і заставах Н-скага пагранатрада, дзе нам. начальніка па палітчасці таварыш Ільін, ідзе дзейсная падрыхтоўка да XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Святочна ўбраны ленінскія пакоі, у якіх абсталяваны выстаўкі, фотавітрыны, прысвечаныя вялікім перамогам сацыялістычнага будаўніцтва за 23 годы совецкай улады, абаронай магутнасці Совецкага Саюза. У фотавітрынах прадстаўлены многія байцы, малодшыя камандзіры, выдатнікі баявой і палітычнай падрыхтоўкі.

У перадкастрычніцкім сацыялістычным спаборніцтве, аспарваючы пярэдняства ўдзельнічае ўвесь асабовы састаў падраздзялення і заставы ў цэлым. Бліскучымі паказчыкамі ў справе авалодвання баявой і палітычнай падрыхтоўкай сустракаюць пагранічнікі вялікае свята. Значна павялічылася колькасць выдатнікаў: ёсць цэлыя заставы выдатнікаў-байцоў. Поўнасцю дабілася выдатных адзнак у перадкастрычніцкім сацспаборніцтве застава, дзе палітрукам ордэнаносец тав. Савельеў. Самыя лепшыя аддзяленні на заставе камандзіраў т. т. Везоўскага і Міціна, дабіліся ганаровага права ў дзень свята 7 лістапада несці пачэтную сталінскую вахту па ... дзяржаўных граніц. На ганаровую вахту па ахове дзяржаўных граніц станоўць таксама знатныя байцы, якія праславілі сябе геройствам пры абароне граніц СССР: баец-ордэнаносец тав. Гаўрылаў, баец-ордэнаносец Кузняцоў, малодшы камандзір Найдзёнаў, узнагароджаны Ордэнам Чырвонага Сцяга, лепшае аддзяленне выдатнікаў малодшага камандзіра Акуліна і др.

Група пагранічнікаў, якой кіруе па палітпадрыхтоўцы нам. палітрука тав. Каралёў, пры ... верцы вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва дабілася адзнак па палітпадрыхтоўцы на выдатна. Такія адзнакі тут маюць пагранічнікі і па баявой падрыхтоўцы. Байцы групы нам. палітрука Каралёва таксама атрымалі права несці пачэтную сталінскую вахту ў дзень ... на дзяржаўнай ... ніцы.

За ... лота... ...ны п... ...ходзяць гутаркі. Д... ...ва на ...цы сярод асабовага ... ...ліна — тэму „Партыя Ленін... ...ялістычнай рэвалюцыі", „Расце і шырыцца Саюз Совецкіх Сацыялістычных Рэспублік", „Чырвоная Армія на варце ... ...ны сацыялізма" і г. д.

У ленін... ...пакоях падабрана і выстаў... літаратура ў дапамогу ба... ...кам, агітатарам, да... ...аб XXIII гадавіне ...кладчы... і па выбарах у мя... Кастры... ...веты дэпутатаў працоўных ...цовых ...цоўных ...ганізацыя пагранатрада ... 49 чалавек кваліфікаваных ... ...чыкаў для правядзення ... ...аб XXIII гадавіне Ка... ...цоўны ў па... гр... ...агітатарам ...тары... ...правод... ...ніцтва. ...расці... ...не аб... і Сталін...

Дзе... гурткі ... ...кай сам... ...пагранічн... ...тву пагр... ...тацкія здо... ...датна пастаўл... ...на заставе, дзе палітр... ...стратаў. Ён сам з'яв... ...ятарам мастацкай са... Мастацкія выступленні ...нікаў карыстаюцца ў заст... заслужанай любоўю і ...насцю.

Пагранічнікі прымаюць ...ўдзел у выборчай кампаніі ... арганізацыя вылучыла ... ...ту агітатарамі сярод насельні... ...48 комуністаў і комсамольцаў ...жо праведзена 75 гутарак і ... ...ў сярод выбаршчыкаў у вёсках па Палажэнню аб выбарах і Канстытуцыі.

Зах. АВА. **Р. Каралёў.**

Гісторыя адной справы

Ва Указе ад 26 чэрвеня ясна сказана, што парушальніка працоўнай дысцыпліны патрэбна адразу прыцягваць да адказнасці і разбіраць іх справы ў пяцідзённы тэрмін.

Пагаварыце з пракурорам Кляшчэльскага раёна, з нарсуддзём Черкасавым і яны вам дасолоўна і пунктуальна скажуць аб тым, як запісана ва Указе ў адносінах разбору судовых спраў аб дэзарганізатарах працоўнай дысцыпліны.

Але... гэтыя людзі засвоілі толькі добра тэорыю, а з практыкай у іх не клеіцца. Вось гісторыя:

27 чэрвеня, на другі дзень пасля апублікавання Указа, грамадзянін Мішчук Сяргей паступіў на работу слесарам у дэпо станцыі Чэрэмха і роўна праз два дні „пераляцеў" на работу ў сельпо Волчын, Высокаўскага раёна.

Злачынства ў наяўнасці. Указ парушан. Пракурор участка чыгункі ўзнімае справу на Мішчука і прад'яўляе яму абвінавачванне па артыкулу пятаму Указа. Праз дванаццаць дзён рабіны пракурор ...а справе піша „заключэнне" і пасылае справу ў суд.

Першы этап следства закончан. Народны суддзя Черкасаў, ведаючы, што ... разглядаецца ў пяцідзённы тэрмін з „маланкавай" хуткасцю, уносіць справу на падрыхтоўчае пасяджэнне і назначае яе для слухання на 31 ліпеня. Абвінавачны ў суд не з'явіўся, звестак аб уручэнні яму павесткі не было. Слуханне справы пераносіцца на 6 жніўня. Мішчук зноў не атрымаў павесткі і ў суд не з'явіўся.

Праходзіць месяц валакіты, папяровай перастрэлкі паміж пракурорамі Кляшчэль і Высокага, паміж Кляшчэльскім судом і міліцыяй, а справа ні з месца. Дзятуна на свабодзе.

І тут суддзя Черкасаў ...думаўся. Думаў, думаў і ... ...віць розыск Мішчука ... ...зміяніць яму меру п... ...гаты-ж ...

...куль у суд паступае папера, у якой напісана:

„Тав. Черкасаў, расшукваемы вамі Мішчук Сяргей пражывае ў вёсцы Волчын, Высокаўскага раёна, і працуе ў сельпо.

Не прачытаўшы добра гэтай шчулькі, суддзя ўсё-ж 8 жніўня накіроўвае сваё рашэнне ў міліцыю. На твары суддзі іскрылася шчасце. „Ад міліцыі не ўцячэ лятун, яго даставяць у суд. І тады трымайся!..."

А ў міліцыі рабілі сваю справу. Аб праробленым не дакладвалі суду...

У Черкасава гублялася цярпенне, 4 верасня ён разглядзеў справу па сутнасці, і зноў у судзе не аказалася звестак аб уручэнні падсудным павесткі. Няма даных аб тым, што Мішчук ухіляецца ад яўкі ў суд. Але суддзя па-свойму робіць вывады і рашае разглядзець справу ў адсутнасці падсудзнага. Прыгавор аглашон заочна і накіраван для неадкладнага выканання ў міліцыю Высокаўскага раёна, па месту жыхарства асуджанага.

На другі дзень, пасля рашэння суда, г. зн. 5 верасня, міліцыя Кляшчэльскага раёна паведамляе суду:

„... Асуджаны вамі Мішчук Сяргей намі знойдзен... у Брасцкай турме".

Чытач здагадаўся, што падсудны Мішчук быў расшукан Высокаўскай міліцыяй яшчэ пасля апрадзялення суда 6 жніўня, але аб гэтым усе ўмаўчвалі.

Суддзя Черкасаў абрадаваўся і п і ш а ... начальніку Брасцкай турмы: „...Накіроўваецца вам прыгавор аб Мішчуку для выканання. Адначасова просім растлумачыць Мішчуку, што ён адхіляўся ад яўкі ў суд, пагатаму народны суд адклаўня вынес апрадзялення і зміняў яму меру прадпрымання на розыску яго, і міліцыя заключыла пад стражу".

На гэтым закончылася справа Мішчука. А ...е, па нашай думцы, у ...цкая ... ...ваў ... народных ... ... новая ... ...ару... ...закон... ...суда ...ага



Талачынская арцель мастацкай вышыўкі „Чырвоны тэкстыльшчык" другі год экспануе свае вырабы на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы. На здымку: (злева направа): стаханаўкі-вышывальшчыцы В. А. Ермашкевіч, ...ота І. Шышко. В. М. Крамянецкая і Р. Г. Штэйфман. Фотахроніка Белта.



...ў на ...чэ ...чытанне! ...р у по... ...пытаў.

Фота ТАСС.

Да XXIII гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі

КРАІНА МАГУТНАЙ ІНДУСТРЫІ

У далёкія часы падарожнік, ...дучаму з канца ў канец Расіі, ...адкрываўся з вакна вагона адзін ...той жа безрадасны малюнак. На ...тогія сотні кілометраў цягнуўся ...дзіваснай, сумны пейзаж: не ...агледныя, бясконцыя палі, укрыў ...і ўкос арэзаныя жабрацкімі сялянскімі надзелам. Калёсы ...грымелі на стыках тры і пяць ...гадзін, і раптоўна ўзнікалі ...агні — то курылася высокая труба фабрыкі або завода. ...Але поезд хутка пакідаў азаду ...мечаканы базіс прамысловасці, і перад падарожнікам зноў адкрывалася бязбрэжнае жытняе царства.

Царская Расія была адной з самых адсталых краін Еўропы. Яна вывозіла толькі хлеб і толькі сыравіну. Прамысловыя прадпрыемствы, рэдка раскіданыя па гігантскіх прасторах, не маглі абслугоўваць гаспадарку краіны. З-за граніцы прывозіліся не толькі машыны, але нават галантарэя — ...ажкі, грабёнкі...

Даве доўга цягнуўшыяся вайны — імперыялістычная і грамадзянская — канчаткова знясілілі гаспадарку. Калі сышлі гарматы і ...Совецкай рэспублікі выгнаношыя рэшткі белагвардзейцаў і інтэрвентаў, гаспадарка ...ўяўляла сабой карціну поўнага разбурэння ...бязлітаснейшай. Патухлі ...ны фабрыкі і заводы. ...ны Совецкую Расію ...ставаліся на шы... і багацця, думка стварыць новую народную гаспадарку на базе высокай тэхнікі — такая думка магла паказацца смелай фантазіяй.

Але комуністычная партыя здолела ўдыхнуць у шматмільённыя народныя масы веру ў сябе, у свае невычарпальныя сілы.

Адначэсна народная гаспадарка, зруйнаваная вайной. Да 1926 года прамысловасць у асноўным ужо дасягнула даваеннага ўзроўню.

Партыя Леніна — Сталіна паставіла перад рабочым класам СССР новую задачу — стварыць магутную індустрыю, дагнаць і перагнаць у тэхнічна-эканамічных адносінах найбольш перадавыя капіталістычныя краіны.

Задавальваецца ранейшым, адсталым узроўнем народнай гаспадаркі — азначала асудзіць краіну і рэвалюцыю на пагібель.

Партыя большэвікоў указвала народу:

— Калі па-ранейшаму мы будзем прывозіць з-за граніцы машыны, калі мы не будзем мець увутры краіны мноства перта... ...заводаў, ...льных у вялікі... ...

...ны, дывелі і ...бычай імпе...

Совецк... ...ная ... ...ная ўлас... ...

І нарэ... ...рача ...

На шматлюдных плошчах совецкіх гарадоў выстаўлялісь вялікія карты-шчыты з рэльефным паказам будоўляў. Натоўпы народу падоўгу з захапленнем разглядалі гэтыя карты, адзіўляючыся размаху будаўніцтва. Уся карта краіны была ўсеяна значкамі, якімі адзначаны былі новыя шахты, новыя электрастанцыі, новыя домны, мартэны, новыя заводы машынабудаўніцтва, новыя тэкстыльныя фабрыкі, нафтаперагонныя і нафтаачышчальныя заводы і інш.

То былі годы вялікага напружання. Перамогі даваліся нялёгка. Краіне прыходзілася ў многім сабе адмаўляць.

Замаскаваныя ворагі спрабавалі падарваць волю і дух народа. Трацкісты і бухарынцы спэрджалі, што замест непасільнай індустрыялізацыі было-б лепш пашырыць лёгкую прамысловасць, прывазіць набольш сыравіны для вытворчасці прадметаў шырокага спажывання.

Партыя большэвікоў разгадала варожыя планы, накіраваныя на тое, каб затрымаць і сарваць сацыялістычнае будаўніцтва. Ворагі народа былі выкрыты і абезшкоджаны.

Таварыш Сталін гаварыў:

„Вядома, мы маглі-б тры мільярды рублёў валюты, здабытых шляхам самай жорсткай эканоміі і затрачаных на стварэнне нашай індустрыі, — мы маглі-б іх накіраваць на імпарт сыравіны і ўзмацненне вытворчасці прадметаў шырокага спажывання. І гэта таксама свайго роду „план". Але пры такім „плане" мы не маглі-б ні мець турбіны, ні машынабудаўніцтва, ...трактараў і аўтамабіляў, ні ...танкаў. Мы аказаліся-б бязбройнымі перад знешнімі ворагамі. Мы падарвалі-б асновы сацыялізма ў нашай краіне. Мы аказаліся-б у палоне ў буржуазіі, унутранай і знешняй".

Гэта вельмі добра разумелі рабочыя і сяляне. Мільёны герояў сацыялістычнага будаўніцтва высоўвалі па сваёй ініцыятыве сустрэчныя планы, яны паскаралі тэмпы будаўніцтва. Сацыялістычнае спаборніцтва стала выражэннем агульнанароднай волі.

Першы пяцігадовы план індустрыялізацыі народнай гаспадаркі, дзякуючы гераічным намаганням усіх працоўных, быў выкананы ў чатыры гады (1928—1932 гг.).

Краіна тэхнічна пераўзброілася за чатыры гады.

Немагчыма пералічыць усе прадпрыемствы, усе заводы і фабрыкі, закліканыя да жыцця першай сталінскай пяцігодкай.

Адсталая некалі краіна стала перадавой індустрыяльнай краінай. Яе мірная праца, яе перамогі і заваяванні аберагаліся магутнай Чырвонай Арміяй, багата насычанай усімі відамі першакласнай баявой тэхнікі, створаемай унутры краіны.

У 1935 годзе таварыш Сталін сказаў, што ранейшы лозунг „тэхніка вырашае ўсё" устарэў і нуждаецца ў істотным дапаўненні: цяпер ужо „кадры вырашаюць усё".

Наступіла новая эпоха, пачыналіся дні яшчэ больш імклівага руху Совецкай краіны на пуцях эканамічнага спаборніцтва з самымі перадавымі капіталістычнымі дзяржавамі.

Пафас будаўніцтва быў дапоўнен пафасам асваення.

Данецкі шахцёр Аляксей Стаханаў паклаў пачатак таму нева... ...галіне пра... ...дс... ...якое ...атры... ...мал... ...ханаўскага ...руху ...і ... ...ыма толькі ў ...раіне, ...дзе не... ...ды пакончана з эксплоатацыяй ...алавека чалавекам, дзе праца ...стала справай чэсці, доблесці і геройства і дзе рэзультаты працы дастаўляюць іх творцам пачуццё сапраўднай радасці.

Стаханаўскі рух, пачаўшыся ў шахтах Данбаса, у кароткі тэрмін ахапіў сабой усе галіны прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Тысячамі і дзесяткамі тысяч высоўваюцца ў СССР героі сацыялістычнай працы, якія навучыліся выціскаць максімум магчымага з першакласнай тэхнікі.

СССР — краіна магутнай індустрыі — развіваецца непарыўна. Гігантскімі здаваліся выдаткі, зробленыя на будаўніцтва у першай пяцігодцы, — 51 мільярд рублёў. Велізарны ўзрост прадукцыйнасці працы дазволіў павялічыць выдаткі на будаўніцтва новых прадпрыемстваў у другой пяцігодцы да 115 мільярдаў рублёў, а ў сучаснай, трэцяй пяцігодцы намечана затраціць на капітальнае будаўніцтва 192 мільярды рублёў.

Да 1939 года совецкая прамысловасць вырасла больш, чым у дзевяць разоў у параўнанні з 1913 годам.

Па размерах валавой прадукцыі сваёй прамысловасці Совецкая краіна выйшла на першае месца ў Еўропе і ўступае цяпер толькі Злучаным Штатам Амерыкі.

У СССР створаны новыя магутныя галіны прамысловасці, аб якіх старая, царская Расія не смела і мярыць: у нас ёсць заводы самалётабудаўніцтва, трактарабудаўніцтва, аўтамабілабудаўніцтва, станкабудаўніцтва і інш.

СССР — эканамічна незалежная краіна, здольная вытвараць на сваіх заводах любыя машыны.

Па выпрацоўцы электраэнергіі Совецкі Саюз к канцу другой пяцігодкі абагнаў ранейшую Расію ў 18 раз і перасунуўся з 15-га на 3-е месца ў свеце.

Па здабычы нафты СССР заняў другое месца ў свеце пасля ЗША.

СССР вытварае чыгун у тры з палавінай разы больш, сталі — у чатыры разы больш і амаль у чатыры разы больш пракату, чым ранейшая Расія ў 1913 годзе.

Цяпер падарожнік з вакна вагона ўбачыць зусім іншы малюнак: надзвычайна змяніўшыся пейзаж краіны. Замест жабрацкіх палёў, кой-дзе ўзрытых сахой, перад ім раскінуцца шырокія і багатыя калгасныя масівы, на якіх шумяць трактары, камбайны, аўтамабілі. Замест ранейшых рэдкіх базісаў прамысловасці ён убачыць незлічонае мноства заводаў пабудаваных альбо палкам рэканструіраваных гігантаў сацыялістычнай індустрыі.

Ніштo не магло перашкодзіць ператварэнню СССР у магутную індустрыяльную дзяржаву.

Ніштo не зможа перашкодзіць народам СССР і ў выкананні новай гігантскай задачы, пастаўленай таварышам Сталіным, — дагнаць і перагнаць найбольш развітыя капіталістычныя краіны Еўропы і ЗША таксама і ў эканамічных адносінах, гэта значыць у самым размеры вытворчасці на душу насельніцтва.

Кіруючыя партыяй большэвікоў, натхнёныя геніям Сталіна, народы СССР з перамогай прыдуць да светлай будучыні, да комуністычнага грамадства.

А. Ісаеў.

208

Гомельскі чыгуначны тэхнікум за апошнія 10 год падрыхтаваў 1250 паравознікаў, эксплаатацыйнікаў і другіх спецыялістаў чыгуначнага транспарта.

На здымку: група комсамольцаў — выдатнікаў вучобы і старэйшых выкладчыкаў тэхнікума. Злева направа: студэнты 4-га курса А. Я. Клімонка і І. Б. Алесенкаў, загадчык вучэбнай часцю М. М. Пеккер, студэнты 3-га курса В. С. Карпухін і А. Е. Ерашова і інспектар вытворчай практыкі А. Г. Харук.

Фота К. Якубовіча. Фотахроніка Белта.

Зіму сустракаем падрыхтаванай

У мінулую зіму лесахімкамбінат адчуваў многа цяжкасцей у рабоце. Не былі ацеплены цэхі, недаставала паліва і сыравіны. Усё гэта мы ўлічылі ў гэтым годзе.

Яшчэ летам дырэкцыя завода прыступіла да падрыхтоўкі да зімы. У цэхах быў вытвораны рамонт, ацеплены памяшканні і кватэры рабочых, быў створан неабходны запас паліва, прыведзены ў поўную гатоўнасць памяшканні, для сталовай загатоўлена неабходная колькасць прадуктаў.

У пачатку жніўня быў праведзен грамадскі агляд гатоўнасці камбіната да зімы. Гэты агляд дапамог выявіць недахопы і выправіць іх. Склікалі пашыраную нараду гаспадарных работнікаў, начальнікаў цэхаў і брыгадзіраў.

З наступленнем халадоў усім рабочым выдан поўны камплект цёплай спецвопраткі і абутку.

Адрамантаваны ўжчынскі душ і занава пабудаваны душ для жанчын. Вытвораны бягучы рамонт сталовай, якая забяспечана на ўвесь год гародзінай і бульбай.

Дырэкцыя завода правяла капітальны рамонт у 42 кватэрах рабочых і ў 39 кватэрах зрабіла бягучы рамонт. На тэрыторыі камбіната абсталяван і адчынен медыцынскі пункт.

Пры камбінаце вытворана новае будаўніцтва гаража і бульбасховішча на 100 тон. У сувязі з арганізацыяй падсобнай гаспадаркі пабудаван свінарнік на 20 свіней, закончваецца будаўніцтва кароўніка на 25 кароў.

[illegible] цэнтральнай [illegible] ацяплення на камбінаце было. Рабочыя вымушаны былі [illegible] работы [illegible] вытвор-

[illegible] пабудаваны [illegible] магазіна [illegible] сіламі і сродкамі [illegible] назначаны

П. Серак.

Новы парадак

Гутарка са старшынёй камітэта пры Саўнаркоме СССР тав.

У адпаведнасці з пастановай Саўнаркома СССР ад 2 кастрычніка гэтага года з учарашняга дня ўвайшоў у сілу новы парадак назначэння студэнтам стыпендый. Як вядома, на стыпендыі зачисляюцца студэнты, атрымаўшыя ў веснавую экзаменацыйную сесію не менш 2/3 ацэнак „выдатна", а астатнія — не ніжэй „добра", г. зн. пры трох экзаменах — атрымаўшыя дзве выдатныя ацэнкі і адну „добра"; пры чатырох экзаменах — атрымаўшыя тры ацэнкі „выдатна" і адну „добра"; пры пяці экзаменах — чатыры ацэнкі „выдатна" і адну „добра"; пры шасці экзаменах — 4 ацэнкі „выдатна" і дзве „добра"; пры сямі экзаменах — пяць „выдатна" і дзве „добра".

З студэнтаў першых курсаў залічваюцца на стыпендыі прынятыя ў ВУЗ'ы без экзамена выдатнікі сярэдніх школ і атрымаўшыя пры прыёмных экзаменах не менш 2/3 ацэнак „выдатна", а астатнія „добра". Прадталчая экзаменацыйная сесія бягучага года дасць магчымасць атрымаць стыпендыі тым студэнтам, якія дабіваюцца выдатных поспехаў. Стыпендыі захоўваюцца за студэнтамі-стыпендыятамі, абараняючымі дыпломны праект або здаючымі дзяржаўныя экзамены да 1 студзеня 1941 г.

Створаны ўсе ўмовы для ўзмацнення самастойнай работы студэнтаў. Некаторыя студэнты змогуць спалучаць вучобу з практычнай работай. У радзе ВУЗ'аў частка заняткаў будзе праводзіцца ў дзве змены — раніцай і вечарам. Дапускаецца свабоднае наведванне студэнтамі 1/3 вучэбных заняткаў прадугледжаных вучэбным пла-

нам, з [illegible] усіх пра[illegible] усіх экзамена[illegible] ўлеены [illegible]рмины.

Новы парадак назначэння стыпендый студэнтам [illegible] выдатныя поспехі, безумоўна, павысіць якасць вышэйшай адукацыі, будзе стымуляваць рост паспяховасці. Аднак, як паказала праведзеная намі праверка, далёка не ўсе дырэктары ВУЗ'аў забяспечваюць правільнае правядзенне указанняў Камітэта па справах вышэйшай школы, аб змяненні парадку назначэння стыпендый. У асобных ВУЗ'ах дапушчаны грубыя парушэнні. Кой-дзе штучна павышаліся ацэнкі шляхам перадачы дысцыплін, па якіх студэнты атрымалі ў веснавую экзаменацыйную сесію пасрэдныя і нават нездавальняючыя ацэнкі.

Зараз у сувязі з устанаўленнем новага парадку назначэння стыпендый студэнтам па рэзультатах экзаменаў асабліва павысіцца адказнасць прафесараў і выкладчыкаў вышэйшых навуковых устаноў за правільнасць ацэнак ведаў студэнтаў. Прафесары, выкладчыкі павінны ставіць ацэнкі ў поўнай адпаведнасці з тымі ведамі, якія студэнты выяўляюць на экзаменах.

Дырэктары ВУЗ'аў, студэнцкія арганізацыі павінны ў новых умовах работы вышэйшая школы дасягнуць павышэння якасці вышэйшай адукацыі, палітычнага выхавання студэнтаў з тым, каб выпускаць высокакваліфікаваных спецыялістаў, гатовых аддаць усе сілы і веды нашай вялікай радзіме.

(ТАСС).

Англа-германская вайна

Германскія паведамленні

БЕРЛІН, 1 лістапада. (ТАСС). Вярхоўнае камандванне паведамляе: „У выніку асабліва несрыяючых метэаралагічных умоў англійская авіяцыя ўчора зусім бяздзейнічала. Нашы самалёты па-ранейшаму прадаўжалі бамбардыроўку Лондана і другіх важных у ваенных адносінах аб'ектаў Паўднёвай, Цэнтральнай і Усходняй Англіі, у Бірмінгаме і ў паўднёвым прадмесці Брыстоля. Узмоцненай бамбардыроўцы падвергліся важныя ваенныя заводы. Пры налёце на склады боепрыпасаў на захад ад Лондана некаторыя з іх узарваліся. Бамбардыроўкай выклікана крушэнне поезда. У часе налёту на англійскія аэрадромы былі зарэгістраваны прамыя попаданні ў ангары, склады і сховішчы. На бранючым налёце нашы лётчыкі абстралялі з кулямётаў некалькі англійскіх самалётаў, якія знаходзіліся на адным з аэрадромаў, і прычынілі ім пашкоджанні. На захад ад Ірландыі нашай авіяцыяй патоплена англійскае транспартнае судно таннажам каля 6000 рэгістравых брута-тон. Паблізу ўсходняга ўзбярэжжа быў рассеяны каравай непрыяцельскіх суднаў. Адзначана некалькі прамых попаданняў, прычым адно судно, даўжыні моцны крэн, вымушана было спыніцца. Над заходнім узбярэжжам Нарвегіі ў паветраным баю было збіта два непрыяцельскіх самалёты. Германская авіяцыя страт не мела".

БЕРЛІН, 1 лістапада. Як паведамляе Германскае інфармацыйнае бюро, учора ў адным з гарадоў паўднёвага ўзбярэжжа Англіі, у рэзультаце ўдару бомб паблізу вакзала, загарэлася некалькі пакгаўзаў. Пажар хутка перакінуўся на другія аб'екты. Бамбардыроўцы падвергся таксама аэрадром паблізу Бірмінгама, на якім пашкоджана некалькі ангараў і будынкаў.

У Лондане ў рэзультаце бамбардыроўкі ўспыхнулі пажары і адбыліся ўзрывы ў раёне Сіці. У паўднёва-заходняй частцы горада пажка пашкоджаны збудаванні аднаго буйнага завода. Многа бомб было скінута з бранючага палёту на аэрадром, размешчаны на поўнач ад Лондана. Есць падставы меркаваць, што каля 30 непрыяцельскіх самалётаў выведзена са строю.

Англійскія паведамленні

ЛОНДАН, 1 лістапада. Афіцыяльна паведамляецца, што ў ноч на 1 лістапада адзначана новае [illegible] дзеянняў непрыяцельскай авіяцыі над Англіяй. Было скінута некалькі бомб, галоўным чынам, на Усходняй Англіі, раёне Лондана і ў адным з гарадоў у цэнтры краіны. Страты незначныя, колькасць афяр невялікая.

ЛОНДАН, 1 лістапада. Агенцтва паведамляе, што [illegible] учора да поўдня германская авіяцыя праяўляла незначную актыўнасць. Пасля поўдня германскія самалёты зрабілі налёт на розныя пункты краіны, аднак матэрыяльныя страты незначныя.

Ноччу непрыяцельскія самалёты скінулі бомбы ў некаторых раёнах краіны.

Англійская авіяцыя ў ноч на 31 кастрычніка бамбардыравала порты Флісінгэн, Антверпен і германскі порт Эмден. Многа бомб было скінута на Вальхарэн, дзе ўзніклі буйныя пажары.

Амерыканскія паведамленні

НЬЮ-ЙОРК [illegible] ада. Па [illegible] Асошыэйтэд [illegible] падводная [illegible] кастрычніка [illegible] падводных се[illegible] ў ход у Гібралтарскую гавань. Пашкоджаны сеці былі папраўлены. Учора раніцой пад канвоем ваенных караблёў і самалётаў з Гібралтара выйшла 63 гандлёвых судны.

(ТАСС).

[illegible]мерыканскіх самалётаў у Англію

[illegible]ада. (ТАСС). [illegible]зеты „Нью-[illegible]лійскіх кругах [illegible] ў верасні месяцы [illegible]ыло экспартыравана 300 [illegible] Мяркуюць, што такая-ж лічба самалётаў экспартыравана ў Англію і [illegible]трычніку. У лістападзе будзе экспартыравана 300 самалётаў, а да чэрвеня экспарт павялічыцца да 600 самалётаў у месяц.

[illegible]здка амерыканскіх ваенных прадстаўнікоў у Еўропу

[illegible]Ю ЙОРК, 1 лістапада. (ТАСС). [illegible]ведамленню агенцтва Юнайтэд Прэс, амерыканскі ваенны [illegible] ў Італіі палкоўнік Фіске [illegible] для нагляданння за італьянскімі ваеннымі дзеяннямі ў Паўночнай Афрыцы. Амерыканскі палкоўнік Осмэн выехаў у Еўропу з сакрэтнай місіяй. Два афіцэры амерыканскага корпуса сігнальнай службы выехалі ў Англію.

Грэка-італьянская вайна

НЬЮ-ЙОРК, 1 лістапада. Як паведамляе агенцтва Юнайтэд Прэс, грэчаскія лёгкія бамбардыроўшчыкі атакавалі італьянскія транспартныя калоны і войскі, ідуўшыя па дарозе ўздоўж узбярэжжа Іанічаскага мора. Італьянцы спрабуюць прасунуцца па даліне ракі Кальмас да Яніны.

Бамбардыроўцы падвергліся таксама італьянскія базы забяспечання, асабліва ў раёне Мертсекі.

АФІНЫ, 1 лістапада. Грэчаскае агенцтва перадае наступную зводку вярхоўнага камандання грэчаскіх узброеных сіл, датыраваную вечарам 31 кастрычніка: „У раёне Эпіра аперацыі пяхоты і танкаў працягваюцца. Наш контрудар у раёне Мертсекі, у выніку якога адбыліся жорсткія бае, спыніўся